Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 24 (572) Аўторак, 30 чэрвеня 1964 г. Цана 1 кап. Год выдання XVII-ы

Спецыяльны выпуск газеты, прысвечаны завочнаму навучанню

## Падрыхтоўка кадраў па завочнай сістэме — важная дзяржаўная справа

9 красавіка г. г. Савет Міністраў СССР прыняў новую пастанову аб далейшым паляпшэнні вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай завочнай і вячэрняй адукацыі. У пастанове адзначаецца, што падрыхтоўка спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці для народнай гаспадаркі стала адной з асноўных форм павышэння культурна-тэхнічнага ўзроўню шырокіх працоўных мас. У сувязі з гэтым далейшае паляпшэнне вышэйшай і сярэдняй адукацыі з'яўляецца важнейшай дзяржаўнай задачай.

У пастанове адзначаецца, што нягледзячы на пэўныя дасягненні ў падрыхтоўцы спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці, усё яшчэ маюцца сур'ёзныя недахопы. Значная частка студэнтаў не заканчвае ў тэрмін поўны курс навучання, назіраецца вялікі адсеў, асабліва на малодшых курсах, якасць тэарэтычнай падрыхтоўкі спецыялістаў у некаторых выпадках не адпавядае ўзрастаючым патрабаванням. Студэнты завочных ВНУ недастаткова забяспечваюцца падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі. Да чытання лекцый і правядзення іншых вучэбных заняткаў мала прыцягваюцца прафесары, кваліфікаваныя выкладчыкі і спецыялісты вытворчасці.

Як адзначаецца ў пастанове, некаторыя кіраўнікі прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, а таксама грамадскія арганізацыі перагружваюць работнікаў, якія вучацца без адрыву ад вытворчасці, вытворчымі і грамадскімі даручэннямі, не ствараюць неабходныя ўмовы для іх навучання.

Савет Міністраў СССР намеціў рад дзейсных мер па ліквідацыі недахопаў, што маюцца ў падрыхтоўцы спецыялістаў па завочнай і вячэрняй сістэме. Асаблівая ўвага звернута на ўмацаванне вучэбна-матэрыяльнай базы ВНУ, якія вядуць падрыхтоўку спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці, на больш шырокае прыцягненне прафесараў, кваліфікаваных выкладчыкаў і спецыялістаў вытворчасці да правядзення вучэбных заняткаў са студэнтамі-завочнікамі. Пастаўлена задача ўжо ў самы бліжэйшы час, да пачатку навучальнага года, забяспечыць кожнага завочніка поўным камплектам неабходных падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў і вучэбна-метадычнай дакументацыі, арганізаваць сістэматычныя вучэбныя перадачы па радыё і тэлебачанню.

Пастанова Савета Міністраў СССР абавязвае нас прыняць усе меры да таго, каб ліквідаваць істотныя недахопы ў падрыхтоўцы спецыялістаў па завочнай сістэме, узняць узровень тэарэтычнай падрыхтоўкі спецыялістаў, з улікам узрастаючых патрабаванняў.

Універсітэт за апошні час правёў пэўную работу па паляпшэнню якасці завочнай адукацыі. У выніку, павысілася паспяховасць студэнтаў, знізіўся працэнт адсеву, паменшылася колькасць другагоднікаў.

Вельмі прадукцыйна працуюць з завочнікамі кафедры нямецкай мовы, тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку, крымінальнага права і працэсу, грамадзянскага права і працэсу, сістэматыкі раслін, фізіялогіі раслін, педагогікі і псіхалогіі, фізічнай геаграфіі замежных краін, агульнай фізікі і некаторыя іншыя. Дарэчы, кафедра агульнай фізікі, якая названа тут, уваходзіць у склад фізічнага факультэта, які нават не мае сваіх завочнікаў. Тым не менш, завочнікі вельмі добра адгукаюцца аб рабоце кафедры з імі.

Тым не менш у арганізацыі і правядзенні вучэбнага працэсу як у час сесіі, так і ў міжсесійны перыяд маюцца істотныя недахопы.

На жаль, асобныя кафедры да цяперашняга часу па-сапраўднаму, як кажуць, не павярнуліся тварам да завочнікаў. Ці ж можна мірыцца з тым, што, напрыклад, большасць кафедраў матэматычнага факультэта абмяжоўвае сваю работу размеркаваннем вучэбнай нагрузкі. Пытаннямі арганізацыі вучэбнага працэсу са студэнтамі-завочнікамі кафедры матэматычнага факультэта займаюцца зусім недастаткова.

Разам з тым, хацелася б адзначыць вялікую і карпатлівую работу асобных выкладчыкаў гэтага факультэта, у прыватнасці, дацэнта А. Н. Нахімаўскай. Нахімоўская падабаецца студэнтам-завочнікам за яе змястоўныя лекцыі, за паўсядзённую дапамогу студэнтам. Добра адкугаюцца студэнты аб лекцыях кандыдата фізіка-матэматычных навук Р. І. Тышкевіч.

У цэлым жа, пытанне з забеспячэннем студэнтаў-завочнікаў матэматычнага аддзялення высокакваліфікаванымі кадрамі яшчэ не вырашана. Ні адзін з прафесараў матэматычнага факультэта не чытае лекцый завочнікам. Зусім ненармальным з'яўляецца тое, што з году ў год на аддзяленні мяняюцца выкладчыкі, для работы з завочнікамі прыцягваецца шмат «пачасавікоў». Кантроль з боку загадчыкаў кафедрамі за якасцю работы з завочнікамі па сутнасці не вядзецца. І, як вынік, на аддзяленні матэматыкі — самая нізкая паспяховасць студэнтаў-завочнікаў. Многія студэнты, асабліва малодшых курсаў, вымушаны кідаць вучобу ва ўніверсітэце.

Час ужо кафедрам і грамадскім арганізацыям матэматычнага факультэта зрабіць належныя вывады з гэтага, час падумаць над пытаннямі карэннага паляпшэння вучэбнай і вучэбна-метадычнай работы з завочнікамі.

На вялікі жаль, яшчэ раз прыходзіцца гаварыць і пра якасць і тэрміны рэцэнзавання кантрольных работ студэнтаў-завочнікаў. Ці ж можна мірыцца з фактамі, калі работнікі завочнага факультэта вымушаны па 5—6 разоў прасіць асобных выкладчыкаў з'явіцца ў дэканат за атрыманнем кантрольных работ. Многія загадчыкі кафедраў не выконваюць загада рэктара аб выдзяленні адказных асоб з ліку лабаранцкага складу для атрымання кантрольных работ.

Нельга мірыцца і з тым, што многія загадчыкі кафедраў у самы напружаны для завочнікаў час, перад пачаткам сесіі, праверку кантрольных работ даручаюць тым выкладчыкам, што ідуць у водпуск. А выкладчыкі ў такіх выпадках катэгарычна не бяруцца рэцэнзаваць кантрольныя, спасылаючыся на свой адпачынак. На нашы просьбы асобныя загадчыкі кафедраў толькі пацiскаюць плячыма, заяўляючы, што яны не могуць нічога зрабіць.

Вядома, што студэнты-завочнікі маюць вялікія цяжкасці ў забеспячэнні вучэбнай і метадычнай літаратурай. У гэтай справе, здавалася б, павінны былі б дапамагчы кафедры шляхам выдання для завочнікаў асобных лекцый, метадычных распрацовак, пісьмаў і да т. п. Аднак за апошні час кафедры не толькі не ўзмацнілі сваю дзейнасць у гэтым напрамку, але, наадварот, аслабілі. Цяжка знайсці растлумачэнне такім безадказным адносінам да вельмі важнага пытання.

Трэба сказаць і пра забеспячэнне студэнтаў-завочнікаў літаратурай праз бібліятэку. Неабходна прызнаць, што бібліятэка ўніверсітэта за апошні час значна палепшыла сваю работу з завочнікамі. Вядомая частка студэнтаў (у большасці сваёй мінчане і тыя, хто жыве блізка ад Мінска) добра забяспечана вучэбнай літаратурай. Аднак меркаваць па гэтай частцы студэнтаў аб задавальненні бібліятэкай запатрабаванняў усіх завочнікаў было б няправільна.

Многія студэнты, што жывуць у сельскай мясцовасці, працуюць у аддаленых месцах і на транспарце, дрэнна забяспечаны вучэбнай літаратурай. Вось характэрны водгук студэнта 1 курса аддзялення гісторыі В. Качаргіна: «За ўвесь час у бібліятэцы я ўзяў адну-адзіную кнігу і то, калі яна нікому непатрэбнай стала (здалі пасля зімовай сесіі), а я пісаў кантрольную работу зноў, бо першую не залічылі».

Адносіны да студэнтаў-завочнікаў з боку асобных работнікаў бібліятэкі пакідаюць жадаць лепшага. «Прыходзіцца хадзіць некалькі разоў у бібліятэку, — піша студэнт Міронччык, — а бібліятэка спасылаецца на тое, што падручнікі патрэбны стацыянару і вячэрнікам, а завочнікі могуць карыстацца іншымі бібліятэкамі». Работнікам бібліятэкі трэба сур'ёзна падумаць над гэтымі сігналамі завочнікаў, каб карэнным чынам палепшыць абслугоўванне студэнтаў.

У сваю чаргу, варта пагаварыць і пра некаторых завочнікаў, якія па-ўтрымальску ставяцца да бібліятэкі і ўніверсітэта ў цэлым. На ўсе іх намаганні як мага лепш арганізаваць вучобу асобныя студэнты-завочнікі глядзяць пагардліва, маўляў, вы абавязаны нам гэта рабіць. Многія студэнты недаравальна доўга затрымліваюць вучэбную літаратуру без усялякай патрэбы.

Колькі б намаганняў ні прыкладаў дэканат завочнага факультэта, кафедры і выкладчыкі ўніверсітэта да паляпшэння вучэбнага працэсу, усе яны могуць быць дарэмнымі, калі самі студэнты не зразумеюць, што якасць падрыхтоўкі іх, як спецыялістаў, залежыць перш за ўсё ад іх саміх. Студэнт-завочнік павінен трывала засвоіць тую ісціну, што поспехі яго залежаць ад таго, наколькі арганізавана і інтэнсіўна працуе ён над вывучэннем праграмнага матэрыялу ў міжсесійны перыяд.

Між тым, вельмі многія студэнты працуюць бессістэмна, урыўкамі, прыязджаюць на сесіі зусім непадрыхтаванымі для здачы залікаў і экзаменаў. Такія студэнты, як правіла, спрабуюць такія адносіны да вучобы растлумачыць чым хочаце, толькі не сваёй неарганізаванасцю, нядбайнасцю. Яны, прыехаўшы на сесію, спрабуюць за некалькі дзён падрыхтавацца да экзамена, прапускаюць дзеля гэтага вучэбныя заняткі, не разумеючы таго, што гэтым пагаршаюць і без таго цяжкае сваё становішча.

Многія студэнты пры выкананні кантрольных работ дарэмна пагарджаюць гэтым відам вучэбнай работы, імкнуцца спісаць у сваіх таварышаў.

Асобныя студэнты ў час сесій вядуць сябе нетактоўна, дапускаюць грубасць, амаральныя ўчынкі. Работнікі інтэрната часта скардзяцца на студэнтаў-завочнікаў за іх абуральныя паводзіны, пагардлівыя адносіны да людзей, што іх абслугоўваюць.

Усе гэтыя факты сведчаць пра сур'ёзныя прагалы ў выхаваўчай рабоце з завочнікамі. Многія выкладчыкі не ўдзяляюць гэтаму пытанню належнай увагі.

У святле рашэнняў чэрвеньскага Пленума ЦК КПСС і пастановы Савета Міністраў СССР ідэйна-выхаваўчай рабоце са студэнтамі-завочнікамі неабходна ўдзяліць максімум увагі. Універсітэт прызваны выпускаць спецыялістаў не толькі тэарэтычна падрыхтаванымі, але і ідэйна загартаванымі, маральна гатовымі да рашэння задач камуністычнага будаўніцтва.

**У. Р. ІВАШЫН,**
**дэкан завочнага факультэта.**
**В. І. СТАРАВОЙТАЎ,**
**намеснік дэкана.**

## *ПЛЮСЫ І МІНУСЫ*

**Асноўная маса студэнтаў юрыдычнага факультэта вельмі добрасумленна ставіцца да выканання вучэбных планаў, своечасова прыязджае на экзаменацыйныя сесіі, акуратна наведвае лекцыйныя і семінарскія заняткі, паспяхова выконвае пісьмовыя работы, здае экзамены і залікі.**

**Выдатна здаюць экзамены многія студэнты: Аршаўскі, Бабыр, Васільеў, Кахановіч, Зубкевіч і многія іншыя. Са 109 шасцікурснікаў толькі адзін Міхайленка атрымаў на дзяржаўных экзаменах нездавальняючую адзнаку. Два студэнты — В. Сычоў і Ф. Чугуноў атрымалі дыпломы выдатнікаў.**

**Асобныя студэнты (сярод іх — Логінава, Назараў, Хітракова, Пазняк, Аўтухоў і іншыя) нядбайна ставяцца да сваёй вучобы, яны сістэматычна атрымоўваюць нездавальняючыя адзнакі, з цяжкасцю пераходзяць з курса на курс.**

**На факультэце працуюць вопытныя штатныя выкладчыкі. Кафедры і вучоны савет сістэматычна абмяркоўваюць пытанні завочнага навучання. У цяперашні час усе студэнты забяспечаны праграмамі і вучэбна-метадычнымі дапаможнікамі. Але падручнікаў яшчэ не хапае. Па асобных дысцыплінах на курс у 100—120 чалавек прыходзіцца па 5—10 падручнікаў.**

**Выклікаюць трывогу вынікі праверачнага дыктанту, што быў праведзены на 1 і 2 курсах. Некаторыя студэнты (Рамашэўская, Мядзведзеў, Бакароў і іншыя) зрабілі па 30—40 памылак! Вось як яны пішуць: «задолгие века», «не обятин», «интиресовавших», «гумонист», «неисеекаемый», сочитание», «провота» (Рамашэўская), «неисякаемый», «посееный», «гиганский», «прегресивный» (Мядзведзеў), «за быть», «он не поверить», «шол», «от тачивали», «отрымели» (Бакароў).**

**А. КРАМНІК,**
**метадыст завочнага факультэта.**

Кантроль у дзеянні

## Аб арганізацыі вучэбнага працэсу на біяфаку

Пытанне аб выкананні вучэбных планаў на біялагічным факультэце стаяла на павестцы дня чарговага пасяджэння ўніверсітэцкай групы садзейнічання партыйна-дзяржаўнаму кантролю. Камісія, у склад якой уваходзілі М. М. Чапінога, М. М. Паўленка, У. М. Сітнікаў, знайшла шэраг недахопаў у планаванні заняткаў, у размеркаванні нагрузкі выкладчыкаў.

Вызначана, што вучэбны працэс на факультэце ў 1963/64 навучальным годзе праходзіў, у асноўным, нармальна. Факультэт укамплектаваны высокакваліфікаванымі кадрамі (13 прафесараў, 24 дацэнты і кандыдаты навук, 8 асістэнтаў і 47 аспірантаў).

Недахопам у рабоце факультэта з'яўляецца тое, што некаторыя кандыдаты навук не чытаюць лекцый, а абмяжоўваюцца толькі правядзеннем практычных заняткаў. Не заўсёды нагрузка выкладчыкаў раўнамерна размяркоўваецца на працягу ўсяго года. Перагрузка ў асобныя месяцы адбіваецца на якасці работы.

Група садзейнічання партыйна-дзяржаўнаму кантролю лічыць ненармальным і той факт, што нагрузкі асобных выкладчыкаў значна перавышаюць норму (да 900 гадзін). Студэнты факультэта часта бываюць перагружаны заняткамі (па 40 гадзін у тыдзень), а гэта таксама ненармальная з'ява.

Індывідуальныя планы выкладчыкаў аформлены нядбайна. Улік прачытаных лекцый і праведзеных практычных заняткаў таксама пакідае жадаць лепшага. Ліхаманіць вучэбную работу факультэта прыцягненне выкладчыкаў-сумяшчальнікаў.

Група садзейнічання партыйна-дзяржаўнаму кантролю прапанавала дэканату біялагічнага факультэта і вучэбнай частцы ўніверсітэта ліквідаваць адзначаныя недахопы ў будучым навучальным годзе.

## Універсітэцкія навіны

**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У. І. Леніна аб'явіў прыём на дзённае і вячэрняе навучанне па наступных спецыяльнасцях: беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура, журналістыка; гісторыя; правазнаўства; хімія; матэматыка; біялогія; геаграфія; фізіка, радыефізіка і электроніка.**

* * *

**Рэдакцыя газеты «Знамя юности» і БДУ імя У. І. Леніна правялі другі тур матэматычнай алімпіяды 1964 года. У другім туры, які праходзіў у форме гутаркі выкладчыкаў універсітэта з удзельнікамі алімпіяды, спаборнічала 512 чалавек. 140 удзельнікаў другога тура, якія атрымалі выдатныя і добрыя адзнакі, рэкамендаваны для паступлення на матэматычны і фізічны факультэты ўніверсітэта.**

